

# Прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь ЛІНГУ С.С.

Паважаны Сяргей Сцяпанавіч!

Сардэчна віншую Вас са знамянальнай падзеяй у Вашым жыцці — 60-годдзем з дня нараджэння.

Ваш шлях да юбілею быў насычаны напружанай і плённай працай. За свае лепшыя чалавечыя якасці — душэўную чуласць, сціпласць, сардэчную цеплыню, за працавітасць і прафесіяналізм Вы заслужана здабылі вядомасць і аўтарытэт як у нашай краіне, так і за яе межамі.

У наш пераломны час, калі ад кіраўніка патрабуюцца воля, энергія і здольнасць прымаць смелыя, неардынарныя рашэнні, Вы як кіраўнік урада суверэннай дзяржавы цалкам аддаяце свае сілы, веды і вопыт для ўмацавання эканамічнай магутнасці рэспублікі, паляпшэння дабрабыту працавітага беларускага народа і развіцця нацыянальнай культуры.

Ад усёй душы, паважаны Сяргей Сцяпанавіч, жадаю Вам і Вашым блізкім моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту, новых працоўных поспехаў на карысць нашай Радзімы.

**З павагай Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**